## § 37. Рознаскланяльныя назоўнікі

**222.** Прачытайце тэкст. Растлумачце, чаму ён мае такую назву.

### Юны псіхолаг

Аднойчы **суседка** папрасіла, каб Жэня пабыў з яе чатырохгадовым **сынам** Толікам. **Дзіця** не хацела адпускаць маці, плакала. Валянціна Пятроўна пачала суцяшаць яго, але **хлопчык** не супакойваўся, а плакаў яшчэ мацней. Тады Жэня сказаў:

— Плач, Толік, плач! Мне нават падабаецца, як ты плачаш.



Спачатку хлопчык нібыта не чуў такой дзіўнай просьбы і працягваў плакаць. Потым на момант сцішыўся, а Жэня сур'ёзна і спакойна працягваў гаварыць дзіцяці:

— Калі ласка, Толічак! У цябе гэта добра атрымліваецца — ніхто ў нашым доме не ўмее так прыгожа плакаць. Ты зараз паплач — я паслухаю. Пасля ты крыху адпачнеш — я пасплю. І ўсё ў нас будзе цудоўна!

Толік выцер слёзы, усміхнуўся Жэню і зусім супакоіўся. Яны з дзіцём так захапіліся гульнёй, што не заўважылі, як вярнулася Валянціна Пятроўна. Шчыра падзякавала мама за клопат аб дзіцяці *(Паводле М. Слівы)*.

Вызначце скланенне выдзеленых назоўнікаў. Якія словы нельга аднесці ні да аднаго з трох скланенняў? Чаму?

Выпішыце з тэксту ўсе склонавыя формы назоўніка *дзіця.* Пастаўце да іх пытанні, вызначце склон. У якіх склонавых формах гэтага назоўніка ёсць суфікс ***-яц-***? Абазначце суфіксы і канчаткі.

● Які канчатак меў бы ўласны назоўнік *Жэня* ў форме давальнага склону, калі б ён абазначаў імя дзяўчынкі?

Назоўнікі, якія пры змяненні па склонах набываюць канчаткі назоўнікаў розных тыпаў скланення, адносяцца да **рознаскланяльных**. Да іх належаць:

- назвы маладых істот: *дзіця(-ё), цяля(-ё), кураня(-ё)*;
- назоўнікі на ***-мя***: *імя, племя, стрэмя*;
- назоўнікі мужчынскага роду з канчаткам ***-а (-я)***: *дзядуля, Вася, стараста.*



Правообладатель Национальный институт образования

**223.** Прачытайце тэкст, ставячы словы, што ў дужках, у правільную форму.

Мы ведаем *(птушкі-прыгажуні)*, што вачэй не адарваць. Не менш бывае і знакамітых *(птушкі-пявунні)*. А між іх зязюля — шэрая, непрыкметная, гераіня песень і казак. Гэта птушка нават *(гняздо)* свайго не ладзіць. Вернецца з ***(вырай)*** і ўсё лятае, кукуе па *(пералескі)* і *(сады)*. Пройдзе час — знясе проста на *(зямля)* яйка. Потым возьме яго ў *(дзюба)* і пакладзе ў гняздо мухалоўкі ці берасцянкі. Праз тыдні два вылупіцца падкідыш — зязюляня. Праз колькі дзён яно павыкідвае з гнязда астатнія яйкі і застанецца адно. Зязюляня вельмі пражэрлівае. Каб яго пракарміць, птушкі-бацькі **шчыруюць** з *(раніца)* да самага *(вечар)* і не здагадваюцца, што кормяць чужака *(Паводле У. Ягоўдзіка)*.

Выпішыце з тэксту словазлучэнні з галоўным словам — дзеясловам і залежным словам — назоўнікам, які ўзяты ў дужкі, ставячы назоўнікі ў патрэбную форму. Вызначце склон назоўнікаў, абазначце канчаткі.

Выпішыце з тэксту назву маладой істоты і праскланяйце яе. Раскажыце пра асаблівасці скланення такіх назоўнікаў.

Да якога разраду лексікі паводле паходжання адносяцца выдзеленыя словы? Растлумачце іх лексічнае значэнне.

Успомніце назвы песень, казак ці легенды пра зязюлю. Якімі рысамі надзяляецца гэта птушка ў мастацкіх творах? Выкарыстоўваючы выпісаныя словазлучэнні як апорныя, перакажыце тэкст.

У родным, давальным і месным склонах назоўнікі адзіночнага ліку, якія абазначаюць назвы маладых істот, набываюць суфікс ***-яц- (-ац-)*** і маюць канчатак ***-і***: *дзіця — дзіцяці, птушаня — птушаняці*.

Суфікс ***-ят-*** гэтыя назоўнікі набываюць ва ўсіх склонах множнага ліку (акрамя назоўніка *дзеці*): *жарабяты — жарабятамі, птушаняты — птушанятамі, шчаняты — шчанятамі*.



Правообладатель Национальный институт образования

**224.** Перанясіце табліцу ў сшытак. Дапішыце патрэбныя формы слоў, дапоўніце кожны слупок сваімі прыкладамі. Якую назву вы далі б табліцы?

| Склон | Скланенне | | Рознаскланяльныя |
|---|---|---|---|
| | 2-е | 3-е | |
| Н. | | | *ласяняты* |
| Р. | *насення* | | |
| Д. | | *радасці* | |
| В. | | | |
| Т. | | | |
| М. | | | |

**225.** Уявіце, што вы збіраецеся паўдзельнічаць у выстаўцы жывёл «Маё кацяня (шчаня)». Да пачатку выстаўкі неабходна ўважліва пазнаёміцца з праграмай, спісам узроставых класаў («Бэбі», «Юніёры», «Прамежкавы») і вырашыць, у якім будзе выступаць ваш гадаванец. Для ўдзелу неабходна запоўніць бланк па прапанаванай схеме:



1) выставачны клас, у які вы хочаце ўключыць жывёлу; 2) прозвішча і імя ўладальніка жывёлы; 3) падрабязныя звесткі пра ўдзельніка выставы; 4) пацвярджэнне ўступнага ўзносу (наяўнасць квітка аб аплаце). Складзіце просьбу аб удзеле ў конкурсе жывёл «Маё кацяня (шчаня)».

Назоўнікі на *-мя* — *імя, племя, стрэмя* — ва ўскосных склонах адзіночнага ліку могуць мець формы з суфіксам *-ен-* або без яго: Р. *імя* (*імені*), Д. *імю* (*імені*), Т. *імем* (*іменем*).

У множным ліку назоўнікі *імёны* і *страмёны* могуць скланяцца з суфіксам *-ён-* і без гэтага суфікса, а назоўнік *плямёны* скланяецца толькі з суфіксам *-ён-*: Р. *імяў* (*імёнаў*), *стрэмяў* (*страмёнаў*), *плямён* (*плямёнаў*).

**226.** Прачытайце тэкст, устаўляючы замест кропак назоўнік *імя* ў патрэбнай форме. Дайце тэксту загаловак.

«Кожнае дзіця мае права на ...» — так запісана ў артыкуле № 20 Закона «Аб правах дзіцяці». Права выбару ... нованаро-



Правообладатель Национальный институт образования

джанаму маюць бацькі. Як запаветны дар ... набывае кожны чалавек. Ён як бы злучаецца з ..., яно становіцца яго спадарожнікам. Цяжка нават уявіць, што ў Пушкіна было б іншае ... . Гэта можна сказаць пра ... і псеўданімы нашых класікаў — Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Уладзіміра Караткевіча.

Іван, Янка, Ян азначае міласць Божую. Кажуць, чалавек з такім ... павінен мець вялікую ўнутраную сілу, незласлівы характар, грунтоўныя веды. Максім у лацінскай мове — найвялікшы. А Уладзімір у старажытных славян быў не інакш як valадар міру. Я патлумачыў толькі некаторыя ... . А кожнае з іх расшыфроўваецца па-свойму. Вось і давайце ўгледзімся, як у люстэрка, у свае ..., убачым у іх сваю гісторыю (*Паводле У. Ліпскага*).

Запішыце першы абзац тэксту, устаўляючы прапушчаныя формы слова *імя*.

● Падбярыце да назоўніка *імя* аднакаранёвыя словы, запішыце іх, разбярыце па саставе.

Спытайце ў бацькоў, чаму вам далі такое імя. Адшукайце інфармацыю пра сваё імя: з якой мовы паходзіць, што абазначае, як уплывае на характар чалавека. Падрыхтуйце вуснае паведамленне на тэму «Маё імя — мая гісторыя» і выступіце перад класам.

**227.** Прачытайце табліцу. Звярніце ўвагу на аснову слоў, месца націску і зрабіце вывад, ад чаго залежаць склонавыя канчаткі назоўнікаў мужчынскага роду на ***-а (-я)***. Дапоўніце табліцу.

| **Склон** | **Назоўнікі м. р. з націскам на аснове** | | **Назоўнікі м. р. з націскам на канчатку** | |
|---|---|---|---|---|
| Н. | *ста́раста Жэ́ня* | *дзяду́ля Ва́сіль* | *суддзя́* | *старшыня́* |
| Р. | *старасты Жэні* | | *суддзі* | |
| Д. | *старасту Жэню* | | *суддзі* | |
| В. | *старасту Жэню* | | *суддзю* | |
| Т. | *старастам Жэнем* | | *суддзёй (-ёю)* | |
| М. | *(пры) старасце Жэню* | *(пры) дзяду́лю Васілю* | *(пры) суддзі* | |


Правообладатель Национальный институт образования

**228.** Прачытайце прыказкі і прымаўкі, ставячы словы ў дужках у патрэбную форму.

1. Самая балючая рана ад свайго *(дзіця)*. 2. У ласкавага *(цяля)* дзве маці. 3. Заяц і жабы баіцца. 4. І сабака на таго не брэша, чый хлеб есць. 5. Страляў у сокала, а трапіў у варону. 6. Спех курам на смех.

Выпішыце з першых двух сказаў назвы маладых істот. Дапоўніце рад, утварыўшы ад назваў жывых істот, якія ўжываюцца ў астатніх сказах, назоўнікі, што абазначаюць маладых істот. Вусна праскланяйце адзін назоўнік у формах адзіночнага і множнага ліку.

## § 38. Нескланяльныя назоўнікі

**229.** Прачытайце тэкст.

**Радзімай сушы** прынята лічыць Сярэднюю Азію. Тут прыдумалі незвычайны **спосаб** кансервавання **рыбы**. Свежую рыбу наразалі, змешвалі з **рысам**, перасыпалі соллю і прыціскалі каменным **прэсам**. Такую рыбу можна было захоўваць цэлы **год**.



Праз некалькі стагоддзяў **рэцэпт** змянілі. З'явілася два **стылі** гатавання сушы — **кансай** (стыль з горада **Осака**) і **эдо** (з **Токіа**). Першы — тое, што называюць «роламі» (маленькія рулецікі з водарасцей, рысу і рыбы), другі — невялічкі кавалачак рыбы на камочку рысу.

З чаго ж гатуюць сушы? Ды з усяго! Каб сушы былі сапраўдныя, у страве абавязкова павінен быць рыс, а да яго можна дадаваць рыбу, крэветкі, кальмары, агародніну (агурок, спаржу, **авакада**), **мяса**.

Падаваць сушы прынята ў парнай колькасці *(З часопіса «Свет падарожжаў»)*.

***во́дарасці***

Перанясіце табліцу ў сшытак. Размяркуйце выдзеленыя словы па адпаведных слупках. Скланяльныя назоўнікі запішыце ў пачатковай форме.



Правообладатель Национальный институт образования